ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1985
6
ЧЭРВЕНЯ
ЧАЦВЕР
№ 21 (1471)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

## Беларускі універсітэт ТЭЛЕТАЙП

*УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА*

### НА БЮРО

камітэта камсамола універсітэта былі зацверджаны камандзіры і камісары студэнцкіх будаўнічых атрадаў.

С. БАЛЦЭВІЧ,
член прэс-цэнтра камітэта камсамола універсітэта.

### ДА 80-ГОДДЗЯ РЭВАЛЮЦЫІ

1905—1907 гг. у Расіі пярвічная арганізацыя Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры БДУ імя У. І. Леніна, кафедра гісторыі СССР дасавецкага перыяду і рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» правялі віктарыну, прысвечаную гэтай даце.

У арганізацыйны камітэт было пададзена 38 работ. Пры вызначэнні пераможцаў журы прымала да ўвагі як дакладнасць і паўнату адказаў, так і яркасць каментарыяў, а таксама афармленне работ. Першае месца прысуджана студэнтам III курса гістарычнага факультэта А. Грыбко і Г. Сучок, другое — студэнтцы IV курса ФПМ А. Скурко, трэцяе — слухачам падрыхтоўчага аддзялення Н. Лаўрык, А. Румаку і А. Сацуце. Студэнты, якія прынялі актыўны ўдзел у конкурсе і паказалі добрыя веды па гісторыі першай расійскай рэвалюцыі, узнагароджаны прызамі.

Ю. КІБАК,
студэнт гістарычнага факультэта.

### «СПАРТЫЎНАЕ ПЯРО»

— так называўся конкурс спартыўных насценных газет факультэтаў. Пры падвядзенні вынікаў журы прысудзіла першае месца насценгазеце «Буравеснік» (факультэт радыёфізікі і электронікі). На другім месцы — «Віраж» (факультэт журналістыкі). Трэцім прызёрам стала насценгазета «Геафак спартыўны». Прыемна адзначыць, што гэтыя насценныя газеты былі лаўрэатамі і мінулагодняга конкурсу.

Віншуем пераможцаў!

У. АБРАМОВІЧ.

### У ПЕРЫЯД ЛЕТНІХ КАНІКУЛАЎ

для студэнтаў будзе арганізавана работа ў лагеры працы і адпачынку «Феадасійскі» і спартыўна-аздараўленчым лагеры «Нарач». Лагер працы і адпачынку будзе працаваць у чатыры змены з 25 чэрвеня да 38 верасня, а «Нарач» — у тры (з 1 ліпеня да 27 жніўня).

З. АЛЯКСАНДРАВА.

## РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ!



*ЧЭРВЕНЬ. Заканчваецца навучальны год. Сесія ўступіла ў свае правы. Для Юрыя Манюка гэта першая летняя сесія. Якой будзе яна — залежыць ад падрыхтоўкі студэнта. Хлопец упэўнены ў сабе: пасля зімовай сесіі ў залікоўцы Юрыя толькі выдатныя і добрыя адзнакі.*

*Усяго год правучыўся Юра, а хлопца ўжо добра ведаюць на факультэце і ва універсітэце. Спорт, грамадскія абавязкі. Асабліва актыўны ўдзел прымае Ю. Манюк у жыцці універсітэцкага прафкома студэнтаў.*

*Пасля службы ў радах Савецкай Арміі Юрый Манюк цвёрда вырашыў паступаць ва універсітэт на факультэт прыкладной матэматыкі, каб у будучым стаць школьным настаўнікам. «Нашы мары ў нашых руках»,— лічыць студэнт.*

Фота А. ВАЛОШЫНА.

## ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

# З ПАЗІЦЫЙ СЁННЯШНЯГА ДНЯ

СПРАВАЗДАЧАМ І ВЫБАРАМ у пярвічных партыйных арганізацыях папярэднічала пэўная падрыхтоўчая работа. Так, у красавіку была праведзена інструктыўная нарада з намеснікамі сакратароў партарганізацый па аргрaбоце. На ёй разглядаліся пытанні падрыхтоўкі і правядзення справаздачна-выбарных сходаў у святле рашэнняў красавіцкага (1985 г.) Пленума ЦК КПСС.

Справаздачы і выбары ахапілі 111 партгруп, 23 партарганізацыі (у ІПК справаздачна-выбарны сход адбудзецца ў верасні).

Ва універсітэце 14 арганізацый маюць партгрупы, у тым ліку на гістфаку, юрфаку, фізфаку, хімфаку, геафаку, НДІ ПФП, філфаку, факультэце радыёфізікі і электронікі, біяфаку, СКТБ з доследнай вытворчасцю і іншыя. Сярод 111 партгрупоргаў 33 — жанчыны.

На справаздачных групавых сходах была дадзена прынцыповая ацэнка рабоце камуністаў, партгрупоргаў, выказаны крытычныя заўвагі.

Патрэбна адзначыць, што недастаткова ўвагі ўдзяляецца наведванню сходаў партгруп членамі партбюро падраздзяленняў.

На добрым узроўні прайшлі справаздачы і выбары ў пярвічных партыйных арганізацыях. На сходах большасць выступленняў камуністаў былі накіраваны на далейшае паляпшэнне вучэбнай і навукова-метадычнай работы, умацаванне працоўнай дысцыпліны. Усебакова прааналізавалі камуністы стан арганізацыйна-партыйнай і ідэйна-выхаваўчай работы. Падкрэслівалася неабходнасць узмацнення кантролю і праверкі выканання даручэнняў, развіцця крытыкі і самакрытыкі, павышэння патрабавальнасці да кадраў, пастаяннага ўдасканалення стылю, форм і метадаў работы. У ходзе справаздач і выбараў выказаны 153 крытычныя заўвагі.

У гэтым годзе павялічылася колькасць жанчын сярод сакратароў пярвічных партарганізацый.

Прыемна адзначыць, што сакратарамі партбюро зноў выбраны В. А. Гайсёнак, Л. П. Прымачук, У. М. Чарнагузаў, В. М. Гадуноў, А. У. Зянкевіч, Л. Ф. Шылава, М. Р. Прыгодзіч, В. Л. Ламака, А. Ц. Манаеў, В. С. Клімовіч, Г. І. Драгун, Р. А. Мужычэнка.

Разам з тым у гэтым годзе сакратарамі партбюро выбраны і новыя ініцыятыўныя камуністы, такія, як М. Э. Часноўскі, А. В. Самаль, Б. С. Каліцін, І. К. Данейка, В. М. Яцухна, Г. М. Пармон, В. В. Беспразванны, І. П. Чэпа.

Аналіз справаздач і выбараў паказвае, што партыйныя бюро не пазбеглі ўпушчэнняў і недахопаў.

У выступленнях некаторых камуністаў адсутнічала крытыка ў адрас канкрэтных асоб. Як паказалі справаздачы старшынь камісій кантролю за дзейнасцю адміністрацыі, работа гэтых камісій вядзецца яшчэ на недастатковым узроўні. Слаба ў справаздачных дакладах адлюстроўваліся пытанні, якія датычаць работы па адбору і рэкамендацыі ў партыю. Перад парткомам ставяцца пытанні ў асноўным аб павелічэнні прыёму ў партыю, але мала гаворыцца аб якаснай падрыхтоўцы кандыдатаў, павышэнні адказнасці тых, хто іх рэкамендуе.

Мала ўвагі ўдзяляецца пытанню расстаноўкі камуністаў на кіруючыя пасады, ролі камсамольскіх работнікаў-камуністаў у партыйнай арганізацыі, партыйнага кіраўніцтва камсамолам, даецца недастатковая партыйная ацэнка кіраўнікам, якія маюць партыйныя спагнанні, а таксама выкладчыкам і супрацоўнікам, якія злоўжываюць спіртнымі напіткамі.

Над чым неабходна зараз працаваць? Перш усё над удасканаленнем стылю і метадаў работы ў партарганізацыях. Мэтазгодна ўстанавіць пастаянны і дзейсны кантроль за практычнай рэалізацыяй крытычных заўваг, выказаных у ходзе справаздачна-выбарнай кампаніі.

Партыйным бюро неабходна забяспечыць далейшае паляпшэнне кіраўніцтва дзейнасцю партгруп, павышаць іх актыўнасць, баявітасць, палепшыць работу па адбору, прыёму у партыю і выхаванню маладых камуністаў, весці яе патрабавальна, больш поўна улічваць думку камуністаў і беспартыйных.

Патрэбна павысіць значэнне кандыдацкага стажу. Далучаць усіх кандыдатаў у члены КПСС да актыўнай работы ў партыйных і грамадскіх арганізацыях. Мэтазгодна заслухоўваць іх на партбюро.

Неабходна шырэй практыкаваць гутаркі, справаздачы, паведамленні камуністаў аб выкананні сваіх абавязкаў, асабліва кіруючых работнікаў, павысіць ролю пярвічных партыйных арганізацый пры разглядажанні пытанняў аб праступках камуністаў-кіраўнікоў.

І яшчэ адна праблема — кадравыя характарыстыкі. Яны павінны ўсебакова і аб'ектыўна адлюстроўваць моцныя і слабыя бакі чалавека, неабходна ў абавязковым парадку зацвярджаць іх на партбюро, пры гэтым павінна ўлічвацца думка партгрупы.

Нам неабходна дабівацца ўзмацнення ўздзеяння партарганізацый на рэзультаты дзейнасці працоўных калектываў, палепшыць кіраўніцтва грамадскімі арганізацыямі, органамі народнага кантролю, аказваць ім практычную дапамогу, больш строга патрабаваць рэзультатыўнасці работы.

Пярвічным партыйным арганізацыям патрэбна паслядоўна і мэтанакіравана ажыццяўляць задачы, пастаўленыя на справаздачна-выбарных сходах, у святле рашэнняў красавіцкага (1985 г.) Пленума ЦК КПСС.

Л. ПАЎЛОВІЧ,
намеснік сакратара парткома па арганізацыйнай рабоце.

XXVII З'ЕЗДУ КПСС — ДАСТОЙНУЮ СУСТРЭЧУ!

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

# ІДЭЙНА-ВЫХАВАЎЧЫ ПРАЦЭС: ШУКАЦЬ НОВЫЯ ФОРМЫ

**Адбыўся сход партыйнага актыву Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. У сходзе прынялі ўдзел інструктар ЦК КПБ П. І. Брыгадзін, сакратар Мінскага ГК КПБ П. К. Краўчанка, інструктар РК КПБ Т. У. Злобіна.**

**На сходзе выступілі: сакратар партыйнага бюро факультэта журналістыкі Л. Ф. Шылава, загадчык кафедры археалогіі гістарычнага факультэта Э. М. Загарульскі, прарэктар па вучэбнай рабоце У. С. Багданаў, дырэктар СКТБ з доследнай вытворчасцю М. І. Акімаў, прафесар кафедры тэарэтычнай фізікі М. М. Шумейка, намеснік сакратара камітэта камсамола І. Вярэнчыкаў, дэкан юрыдычнага факультэта В. Г. Ціхіня.**

**З дакладам выступіў сакратар парткома БДУ імя У. І. Леніна М. І. Дзямчук. Прапануем тэкст даклада ў скарачэнні.**

АСНОЎНЫ РЭЗЕРВ павышэння ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў патрэбна шукаць у паляпшэнні ідэйна-выхаваўчага працэсу, у знаходжанні эфектыўных форм і метадаў індывідуальнай работы са студэнтамі, у сувязі ідэйна-палітычнай работы з жыццём.

Іменна на гэта арыентуе нас красавіцкі (1985 г.) Пленум ЦК КПСС. Усе формы ідэйнага выхавання павінны быць падпарадкаваны галоўнай задачы — паскарэнню сацыяльна - эканамічнага развіцця краіны.

Патрэбна сказаць, што ў справе палітычнага, маральнага і эстэтычнага выхавання ў нас вялікія рэзервы і нявыкарыстаныя магчымасці. Здавалася б, што ў ВНУ, у прыватнасці ва універсітэце, студэнта павінны выхоўваць сцены, інтэлектуальныя абставіны, калектыў, які здольны дасягнуць самых высокіх вяршынь у навуцы. Аднак гэта толькі формула. Мы часам прывыкаем, што яна ажыццяўляецца самастойна, без прыкладання намаганняў. Але прыносіць яна плён толькі тады, калі ў ёй зладжана ўзаемадзейнічаюць усе звенні. Такой зладжанасці ў нас пакуль што няма. На практыцы мы сустракаемся з негатыўнымі з'явамі, якія з'яўляюцца сведчаннем нашых упушчэнняў. На кожнай нарадзе мы гаворым пра пропускі заняткаў, парушэнні дысцыпліны, нездавальняючую вучобу, адсеў студэнтаў, абыякавыя адносіны да грамадскай работы. Гэта ў пэўнай ступені сведчыць аб тым, што ў нас яшчэ няма эфектыўнай сістэмы практычнага ажыццяўлення працэсу камуністычнага выхавання.

Арганізатарамі ідэалагічнай работы закліканы быць партыйныя бюро факультэтаў і падраздзяленняў. Яны асвойваюць тэарэтычную і практычную дзейнасць партыі, распрацоўваюць і ажыццяўляюць у сваіх калектывах стратэгію руху і тактыку паўсядзённай работы па ажыццяўленню выхаваўчага працэсу. Любая справа пад сілу партыйным бюро. Яркім прыкладам гэтаму з'яўляецца падрыхтоўка і правядзенне святкавання 40-годдзя Вялікай Перамогі. Арганізавана, без фармалізму, з удзелам студэнтаў і выкладчыкаў прайшлі дзесяткі, сотні розных мерапрыемстваў, лепшымі з якіх былі ўрачыстыя вечары і сустрэчы на факультэтах, у падраздзяленнях і ўрачысты сход універсітэта. Поспех тут быў забяспечаны ўдзелам усяго калектыву.

Аднак слаба ўдзельнічае ў выхаваўчым працэсе выкладчыцкі састаў. Склалася такое становішча, што толькі на лекцыі ці на практычных занятках вучоба і выхаванне не толькі супадаюць, але і актыўна ўздзейнічаюць на студэнта. Па-за аўдыторыяй аўтарытэт выкладчыка, яго патэнцыяльныя магчымасці выхавацеля роўныя нулю, таму што апошні проста не сустракаецца са студэнтамі.

У нас 103 кафедры, столькі ж і загадчыкаў. Гэта вопытныя педагогі, вучоныя. Але часта даводзіцца шкадаваць аб тым, што іх дрэнна ведаюць студэнты. Загадчыкі кафедраў — галоўныя арганізатары вучэбна-выхаваўчага працэсу па штатнаму раскладу. Першая частка (вучэбная) выконваецца няўхільна — з рамак раскладу не выйдзеш. А вось што датычыцца выхаваўчага працэсу, то тут іншае пытанне. Гутаркі са студэнтамі, арганізатарская, выхаваўчая работа аддадзена дэканатам, дзе больш выхоўваюць інструкцыямі, або гэта важнейшая частка вузаўскага жыцця перакладзена на куратараў.

Такое становішча — раздзяленне навучання і выхавання — неабходна пераадолець. Тым больш, што ад эфектыўнасці выхаваўчай работы ў многім залежыць канчатковы вынік — выпуск спецыялістаў з універсітэцкім дыпломам. Выхаваўчая работа патрабуе індывідуальнага падыходу, а значыць поўнай аддачы кожнага камуніста, выкладчыка, іх уздзеяння не агулам на масу студэнцтва, а на канкрэтную групу, на канкрэтнага чалавека.

Усе ўмовы для добрай арганізацыі індывідуальнай работы са студэнтамі ў нас ёсць. Усяго ва універсітэце працуе 2331 навуковы і навукова-педагагічны работнік. Студэнтаў жа вучыцца 10 тысяч, гэта значыць, у сярэднім пяць студэнтаў на аднаго старэйшага таварыша. Размова ідзе не аб кураторстве, а аб паўсядзённай скрупулёзнай рабоце. А зараз нядрэнна ўспомніць, хто ў апошнія гады працаваў са студэнтамі настолькі цесна, што паявілася неабходнасць запрасіць іх дамоў, хто «заўважыў» студэнта на першым курсе, давёў яго да пятага, зрабіў аспірантам і, нарэшце, сваім пераемнікам. Прыкладаў будзе вельмі мала.

Часта даводзіцца чуць, што раней не было куратараў, а зараз яны ёсць, і гэта, магчыма, дрэнна. Раней у іх не было вялікай неабходнасці: кожны прафесар, дацэнт мелі сваю групу студэнтаў і працавалі з імі штодзень. Пры такім падыходзе пытанне аб тым, хто павінен курыраваць групу, было зразумелым: хто працуе з групай, той і курыруе яе. Такіх куратараў сярод нашых прафесараў — адзін працэнт, карацей, адзін-два прафесары на сотню.

У нас па-за ўвагай выкладчыкаў, кафедраў застаюцца пасрэдныя і адстаючыя студэнты. Гэта пацвярджае і нядаўняе абмеркаванне на бюро парткома работы фізічнага факультэта. Студэнты, якія не паспяваюць, патрабуюць асаблівага падыходу, спецыфічнай методыкі і нават большых затрат энергіі. Мы павінны карэнным чынам перабудаваць работу ў гэтым напрамку, шукаць і знаходзіць шляхі для вываду студэнтаў з разраду адстаючых. Гэта праблема важная, і яе патрэбна вырашаць неадкладна.

Партыйным бюро і дэканатам факультэтаў неабходна правесці дэталёвы аналіз стану вучэбнай і вучэбна-выхаваўчай работы са студэнтамі, распрацаваць і абмеркаваць на рэктараце да 30 верасня стратэгію гэтай работы на будучы навучальны год і на XII пяцігодку ў цэлым.

Да праблем паляпшэння навучання і выхавання студэнтаў ушчыльную набліжаюцца пытанні эфектыўнасці дзейнасці аспірантуры. Адна з найбольш вострых праблем, аб якой шмат гаварылася і гаворыцца на ўсіх узроўнях,— нізкі працэнт тых, хто паспяхова заканчвае аспірантуру. У 1984 годзе па універсітэту ён склаў 44 працэнты, а па МінВНУ БССР — 54,3 працэнта. Такое становішча перш за ўсё тлумачыцца няпоўным выкананнем патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да адбору кандыдатаў для паступлення ў аспірантуру з ліку моладзі, што праявіла здольнасці да навукова-педагагічнай дзейнасці. Недастатковая таксама патрабавальнасць навуковых кіраўнікоў да якасці падрыхтоўкі аспірантаў. Абедзве прычыны з'яўляюцца вынікам недапрацоўкі са студэнтамі. Падчас няма чаго патрабаваць ад аспіранта, таму што ён з'яўляецца тэатэрычна слаба падрыхтаваным і выпадковым у навуцы.

У цяперашні час даволі востра стаіць пытанне аб размеркаванні аспірантаў. Так, сёлета заканчваюць навучанне з адрывам ад вытворчасці 96 чалавек, з іх 35 — мэтавым прызначэннем, 61 аспірант падлягае размеркаванню і толькі на 21 аднаго з іх ёсць заяўкі, астатнія 40 аспірантаў дагэтуль не маюць месц прызначэння. Цяжкасці з працаўладкаваннем — практычна па ўсіх спецыяльнасцях, асабліва востра па матэматычных, філасофскіх, эканамічных, філалагічных навуках.

Відавочна адно: гэта пытанне можна вырашыць шляхам павелічэння набору ў мэтавую аспірантуру. Трэба сказаць, што ВНУ і арганізацыі не заўсёды ў поўнай ступені выкарыстоўваюць такую магчымасць падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі.

Мы гаворым, што кожны студэнт павінен быць на ўліку. Аспірант — тым больш. Падрыхтоўку аспірантаў для патрэб універсітэта неабходна ўшчыльную суадносіць з усёй нашай кадравай палітыкай. Аспіранту патрэбна яснасць у пытаннях працаўладкавання, пры ўмовах добрай вучобы.

Рэктарату, дэканатам неабходна перабудаваць свае адносіны да пытання падрыхтоўкі дактароў навук на XII пяцігодку. Тут мэтазгодна тэрмінова пачаць работу па ўмацаванню ўсіх факультэцкіх звенняў (перш за ўсё кафедраў) дактарамі навук з улікам асноўных спецыяльнасцей, выпрацаваць рэальныя планы падрыхтоўкі і падаць у рэктарат прапановы па аказанню канкрэтнай дапамогі дактарантам.

Працягвае заставацца нізкім узровень выхаваўчай работы ў інтэрнатах. Студэнцкі гарадок цалкам ператварыўся ў адміністрацыйна-гаспадарчы орган і выхаваўчай работай практычна не займаецца, яго прыдаткам з'яўляюцца студсаветы. Прафсаюзныя камітэты і камітэты камсамола нездавальняюча арганізуюць быт і адпачынак студэнтаў, партыйныя арганізацыі прызвычаіліся да такога становішча і не робяць ніякіх захадаў па паляпшэнню гэтай работы.

Такое становішча неабходна выпраўляць. З гэтай нагоды ў кожным інтэрнаце з першага верасня павінны быць адкрыты і пачаць сваю работу літаратурныя клубы накшталт клуба «Красавік» (ФПМ), ленінскія пакоі і чытальныя залы, дзе неабходна праводзіць разнастайныя, не абавязкова масавыя мерапрыемствы. Гэта павінна стаць правілам і неабходным элементам выхавання студэнцтва. Забаронай праводзіць вечары і дыскатэкі даную праблему не вырашыць. Выкладчыкі павінны ісці ў інтэрнаты не вартаўнікамі і нянькамі, а ўдзельнікамі культурна-масавых мерапрыемстваў. Партыйным бюро неабходна накіроўваць для арганізацыі выхаваўчай работы ў інтэрнаты маладых, ініцыятыўных выкладчыкаў. Неабходна зняць лозунг прыкрыцця бяздзейнасці: маўляў, студэнты — дарослыя людзі, ім нянькі не патрэбны! Працэс навучання і выхавання павінен быць непарушным усе пяць гадоў: у аўдыторыі і па-за ёю.

Канкрэтнасць, дзелавітасць, мэтанакіраванасць выхаваўчай работы павінны ахопліваць усю дзейнасць партыйнай, грамадскіх арганізацый, усяго калектыву. Да гэтага абавязвае нас Пастанова ЦК КПСС «Аб мерах па пераадоленню п'янства і алкагалізму». Зараз яна абмяркоўваецца на ўсіх узроўнях. Вынік гэтага абмеркавання — так званы «сухі» закон ва універсітэце, інтэрнатах, на практыцы, у лагерах, студэнцкіх будаўнічых атрадах, усіх месцах, дзе праводзяцца універсітэцкія мерапрыемствы. У нас не павінна быць такіх з'яў, якія мы зараз перажываем: 21 чалавек з ліку студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта ўжо сёлета трапілі ў міліцыю ў нецвярозым стане.

На партыйную арганізацыю, рэктарат, дэканаты, аддзел кадраў, вучэбны аддзел, усе кантралюючыя органы і службы кладзецца адказнасць за няўхільнае выкананне пастановы ЦК КПСС. Натуральна, толькі гэтага недастаткова. Гэта першая частка работы. Другая, і самая значная, заключаецца ў тым, каб агітацыяй, прапагандай, пастаяннай увагай да студэнтаў, асабістым прыкладам пераконваць у вялікай шкоднасці п'янства, укараняць і развіваць у свядомасці моладзі ўсеагульную цвярозасць як неабходнасць далейшага развіцця нашага грамадства, адказнасці за захаванне і памнажэнне народнага дабрабыту, росквіт навукі і культуры.

Партыйныя бюро, дэканаты абавязаны строга кантраляваць выкананне грамадскіх абавязкаў кожным членам нашага калектыву. У нас моцныя кадры, якія валодаюць патэнцыяльнымі магчымасцямі выконваць надзённыя задачы.

У нас ёсць узоры працы калектываў, якія выконваюць свой абавязак у адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі. І іх кіраўнікі, выкладчыкі з вялікай аддачай выконваюць свае выхаваўчыя і навуковыя функцыі. Гэта кафедра батанікі (загадчык А. С. Шчуканаў), дзе добра пастаўлена навукова-метадычная работа, кафедра мікрабіялогіі (загадчык Ю. К. Фамічоў), якая займаецца распрацоўкай праблем у навейшых галінах сучаснай біялогіі, кафедра ядзернай фізікі (загадчык С. С. Шушкевіч), кафедра фізікі паўправаднікоў (загадчык В. Ф. Стэльмах), кафедра радыётэхнікі і фізічнай электронікі (загадчык А. А. Лабуда), дзе паспяхова ажыццяўляюць мэтавую падрыхтоўку спецыялістаў і непасрэдную сувязь з вытворчасцю, кафедра рускай мовы (загадчык Г. П. Шуба), якая праводзіць вялікую работу па выданню і перавыданню падручнікаў для сучаснай школы, кафедра крыміналістыкі (загадчык А. В. Дулаў), якая шырока выкарыстоўвае тэхнічныя сродкі навучання, кафедра аналітычнай хіміі (загадчык Г. А. Старобінец), якая штогод дае не менш аднаго мільёна рублёў эканамічнага эфекту, кафедра марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў (загадчык В. С. Сцёпін), якая жыццяўляе шырокую агітацыйна-прапагандысцкую работу. Вялікі ўклад у развіццё навукі ўносяць механіка-матэматычны факультэт і факультэт прыкладной матэматыкі. На чыста вытворчым ФПМ створана педагагічнае таварыства для цеснай сувязі са школай, укаранення там вылічальнай тэхнікі і навучання настаўнікаў карыстацца ёю.

Прыклады можна працягваць. Актыўная, мэтанакіраваная дзейнасць перадавых калектываў яшчэ ярчэй падкрэслівае тое, што астатнім факультэтам, кафедрам, падраздзяленням трэба карэнным чынам мяняць падыход да справы, каб выйсці на ўзровень сучасных патрабаванняў вучэбна-выхаваўчай работы.

**ВІНШУЕМ!**



*Супрацоўнікі кафедры ядзернай фізікі С. С. Шушкевіч, У. М. Ліneў, Б. Я. Кулікоўскіх і Я. Я. Фурса за комплекснае ўкараненне вынікаў навукова-даследчых, вопытна-канструктарскіх і тэхналагічных работ удастоены прэміі Савета Міністраў СССР за 1985 год.*

**ФАКУЛЬТЭТ ГРАМАДСКІХ ПРАФЕСІЙ**

# У ДОБРЫ ШЛЯХ!

НЯДАЎНА АДБЫЎСЯ ўрачысты вечар выпускнікоў факультэта грамадскіх прафесій. Сход адкрыў старшыня савета ФГП, праректар А. В. Шарапа. Ён павіншаваў выпускнікоў з заканчэннем факультэта грамадскіх прафесій і пажадаў плёну ў далейшай дзейнасці.

Дэкан факультэта К. М. Кунцэвіч падвёў вынікі работы васьмі секцый у мінулым годзе і расказаў аб перспектывах работы ў новым навучальным годзе.

Лепшым куратарам ФГП ад дэканатаў В. Б. Жураўлю (філфак) і З. С. Бузель (мехмат) былі ўручаны Ганаровыя граматы.

Граматамі была адзначана і дзейнасць лепшых старшынь ФГП В. Бікішчанка (факультэт радыёфізікі і электронікі), Г. Ражноўскай (юрфак), Н. Бурак (ФПМ), А. Гаўрыс (геафак), Г. Юсевіч (філфак). А. Нікіфарава (гістфак) і С. Марозка (мехмат) як лепшыя старшыні ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі і каштоўнымі падарункамі.

Граматы атрымалі і найбольш актыўныя слухачы факультэта грамадскіх прафесій Т. Наўгародскі (аддзяленне журналістыкі) і В. Рубін (аддзяленне арганізатараў ваенна-патрыятычнай работы).

Атэстацыйная камісія ФГП рэкамендавала ў члены Усесаюзнага таварыства «Веды» двух лепшых слухачоў школы маладога лектара В. Гаўрыленка (гістфак) і А. Рыхлова (мехмат).

Пасля адбылася творчая справаздача выпускнікоў тэатральнай студыі і аддзялення дыктараў і вядучых. У выкананні Халіла Джалілава, Тацыяны Васіленка, Ігара Куліковіча, Айсары Падабекавай і многіх іншых прагучалі вершы С. Маршака, М. Джаліля, М. Цвятаевай, Я. Коласа.

Бурнымі апладысментамі суправаджалі прысутныя выступленні выпускнікоў студыі бальных танцаў Святланы Жгун і Ігара Міхалёва.

У заключэнне вечара выпускнікі аддзялення кінааператараў паказалі слайд-фільм, прысвечаны дойлідству старажытнай Русі.

С. МАХОЦІНА,
студэнтка філалагічнага факультэта.

**ЧЭРВЕНЬ: НА ПАРАДАК ДНЯ КАМСОРГА**

ПАЧАЎСЯ новы месяц у тваім камсамольскім жыцці, час, калі ты і твая група выконваюць пастанову, прынятую на камсамольскім сходзе мая, на парадку дня якога былі два пытанні: абмеркаванне Пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па пераадоленню п'янства і алкагалізму», падрыхтоўка да сесіі. Рашэнні сходу былі дзелавыя, канкрэтныя. Вы не толькі звярнулі ўвагу на камсамольцаў, якія злоўжываюць спіртнымі напіткамі, але і строга папярэдзілі іх. Вызначылі меры пакарання: выключэнне з радоў ВЛКСМ, з універсітэта. Меры строгія, але справядлівыя. Больш ні на адно мерапрыемства, якое будзе праводзіцца ў групе, ніхто не прынясе спіртнога,— гэта таксама радкі з прынятай пастановы.

Якой будзе сесія? Як зрабіць, каб у залікоўках паявілася як мага больш добрых і выдатных адзнак? Гэта пытанні, якія таксама хвалявалі ўсіх камсамольцаў групы на сходзе. Ты, камсорг, змог растлумачыць, што галоўнае сёння для студэнта — якасць ведаў. Іменна ад іх у недалёкім будучым будзе залежаць якасць працы.

А пасля сесіі ў студэнтаў пачнецца не менш цікавы і напружаны час: іх, маладых, чакаюць справы ў студэнцкіх будаўнічых атрадах.

Так закончыцца яшчэ адзін год твайго студэнцкага жыцця. Ён быў цікавы? Ты, камсорг, зрабіў усё, каб у групе не было фармалізму, каб словы не разыходзіліся са справай? З якімі вынікамі, камсорг, прыйдзе твая група да чарговага XXVII з'езда КПСС?



*Даўняя дружба і супрацоўніцтва звязвае Беларускі дзяржаўны і Сафійскі універсітэты. На розных факультэтах БДУ вучацца пасланцы Балгарыі, у час трэцяга працоўнага семестра ВНУ абменьваюцца будатрадамі. Сувязі шырацца і мацнеюць год ад году. Ў карысць гэтага сведчыць і візіт у наш універсітэт намесніка дэкана факультэта журналістыкі Сафійскага універсітэта Влычка Лазарава Кунчава.*

*НА ЗДЫМКУ: у кабінеце дэкана факультэта журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна ідзе зацікаўленая размова аб творчым супрацоўніцтве.*

*Фота В. ГРАМОВІЧА.*

**СЦЯЖЫНКАМІ ПАМЯЦІ**

ЦЯПЕР, прыгадваючы свае першыя творчыя крокі, яны ўсміхаюцца. Было гэта, здаецца, зусім нядаўна.

А пачыналася так.

Нясмелая спроба пяра ў газетах рознага ўзроўню і напрамку. Не вельмі зразумелае ўяўленне аб выбранай тэме і праблемах. Бясспрэчным было адно: патрэбна пісаць, знаходзіць, разбірацца. Гэта і прывяло ў журналістыку. Журфак, пяць гадоў вучобы. І вось своеасаблівы творчы вынік — выпуск альманаха. Тут лепшае, што напісана. Розныя жанры і тэмы. Адкрываецца ён матэрыяламі, прысвечанымі 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчынай вайне. Спынімся на некаторых з іх.

Г. Козел, замалёўка «Гарыць рабіна пад акном»... Лаканічнасць, паслядоўнасць, лёгкасць успрымання матэрыялу чытачом вызначае стыль аўтара. Невялікія сказы ствараюць вобраз. Некалькі слоў, і перад намі эскіз характару простай вясковай жанчыны-маці. Мужнасць, пачуццё абавязку перад Радзімай — вось яго складаемыя. У даным выпадку галоўны герой — Марыя Козінцава — прыклад самаадданасці і патрыятызму, які праявілі ў гады ваеннага ліхалецця лепшыя сыны і дочкі Айчыны. Здавалася б, нічога геройчнага не здзейсніла яна. Была, як гаворыць сама, сувязной партызанскага атрада. Але гэта значыла, што жанчына кожны дзень глядзела ў твар смерці. М. Козінцава рызыкавала не толькі сваім жыццём, але і лёсам сваіх дзяцей. Подзвіг яе, як і іншых савецкіх людзей, назаўсёды застанецца ў памяці народнай.

Памяць... Хіба толькі ў сэрцах савецкіх людзей жыве яна? Не, лічыць А. Кісялёва. Прыклад таму — яе матэрыял «Сосны не могуць маўчаць». Ужо некалькі гадоў запар студэнты з ГДР удзельнічаюць у інтэрнацыянальным паходзе па месцах баявой і партызанскай славы смаленскай зямлі. Сімвалам яе пакут стаў помнік сярод бяроз. Жанчына застыла, акаменелая ў няўцешным горы сваім, знясіленая і ў той жа час велічная.

Жыве памяць людская, жыве яе боль. Ужо сорак гадоў над нашай зямлёй у мірным небе лятаюць жураві. Але і зараз чакаюць маці сваіх сыноў. Не хочуць верыць, што іх няма. Тэма вайны праходзіць праз замалёўку Н. Антановіч «А маці чакае сына». На дакументальных фактах — лістах сына да маці — аўтар паказвае нам жыццё ў той жудасны час. Здаецца, не было калі і думаць сялянскаму хлопцу ў акопе у перапынках паміж атакамі пра «справы зямныя». Але ў такія рэдкія мінуты думкі яго далёка ад акопнай рэчаіснасці. Усёй сваёй істотай ён перанесіцца дамоў. Душа баліць. Сэрца цягнецца да гаспадаркі, да роднай зямлі. У лістах піша, што ў яго ўсё добра, змен ніякіх няма. І ў кожным пытаецца: як там дома, як гаспадарка? А пра вайну — ні слова. Быццам і няма яе. А яна ішла і нібы смерч забірала з сабою жыцці мільёнаў.

Ляцяць гады... Але не зарастаюць сцежкі памяці. І жыве яна ў свядомасці народаў. Жыве і будзе жыць заўсёды.

**СТУДЭНЦКАЯ РЭЦЭНЗІЯ**

# ТЫРАЖ—ДВА ЭКЗЕМПЛЯРЫ

**Студэнцкія гады праляцелі непрыкметна. Наперадзе — самастойная праца. І як добры ўспамін аб сабе пакідаюць выпускнікі на факультэце журналістыкі альманах.**

**«...І ЗАМАЦОЎВАЕМ КАРЭННЕ»**

ПАЭЗІЯ займае апошнія старонкі альманаха. Аднак гэта акалічнасць не змяншае яе значнасці ў творчасці выпускнікоў. У кожным з твораў выяўляецца паэтычная натура аўтара, патаемныя ўласныя пачуцці і думкі.

Усяго дзевяць вершаў прадстаўлена ў альманаху. Але дадуць агульную характарыстыку паэтычнаму скарбу выпускнікоў нялёгка. Паспрабуем акрэсліць асноўныя рысы іх творчасці.

Падборку вершаў альманаха аб'ядноўвае адвечная тэма — тэма кахання. Праяўляецца гэта па-рознаму. Калі ў вершах В. Палякова пачуццё недзе на паверхні радкоў: «Хочется сказать тебе нежные слова, хочется позвать тебя в росные луга...», то для С. Трусевіча характэрна самапаглыбленне ў супярэчлівы свет закаханага. Складаная кампазіцыя і вобразы, якія набліжаюць часам да арыгінальных, адрозніваюць вершы Сяргея.

Жаданне сказаць узвышана і прыгожа перашкаджае аўтарскай думцы В. Палякова ў вершы «Вечность». «О, странная неба безбрежность», «О ты, безглагольная млечность...» — усклікае ён, пераліваючы вядомыя бальмантаўскія радкі: «безвыходность горя, безгасность, безбрежность... безглагольность покоя».

З першых радкоў А. Сушы чытача пранізвае сум па каханню: «Птушкай назваў, а зараз падрэзваеш крылы...» Балючы дакор гучыць у словах лірычнай гераіні, звернутых да таго, хто «з-за хмарных вышынь на утульную глебу спусціўся. Скарыўся з лёсам азызлым... не лётаць».

«— Ты хочаш мяне адамашніць? — пытаецца яна.— Не зможаш... Як горка... Як страшна». І верыцца: як бы ні мучыла гераіню адзінота, яна не «адамашніць» сваіх пачуццяў, не здрадзіць свайму каханню.

Чатыры страфы Л. Вашко завяршаюць паэтычную старонку альманаха. У іх перш за ўсё вызначаецца пазіцыя аўтара. Ужо ў пачатку верша ён імкнецца па-філасофску асэнсаваць чалавечае жыццё:

Пастаўлена ўжо на кон
Жыццё — апошняе здарэнне,
Мы нараджаемся праз сон
І замацоўваем карэнне...

Лёс чалавека неаддзельны ад лёсу той зямлі, на якую ён нясмела ступіў першы раз у жыцці. Вытокі гэтай, сапраўды кроўнай сувязі Л. Вашко бачыць у людской памяці:

Нас нараджае ўспамін
Праз лёс наканаваны,
Праз смак балотных журавін.
Праз годнасць і заганы...

Просты і знаёмы вобраз «Нас нараджае родны кут на сонечных палянах...» набывае цэласны і глыбінны сэнс у сувязі з наступнымі радкамі: «Праз кроў і тысячы пакут братоў не пахаваных». Вось кошт сонечным палянам нашага дзяцінства.

Верш Л. Вашко вылучаецца простай формай, пэўнасцю думкі, жыццесцвярджальнасцю апошніх радкоў:

Мы нараджаемся праз стогн
І замацоўваем карэнне...

Няхай жа «замацоўвае карэнне» і творчасць выпускнікоў, каб «лёгкія крылы Пегаса не выносілі іх на творчым шляху за воблакі жыццёвай рэчаіснасці».

С. БЯСПАЛЫ,
В. МАЕЎСКІ,
студэнты факультэта журналістыкі.

**ПАЗЫЎНЫЯ ТРЭЦЯГА ПРАЦОЎНАГА**

# НАС ЧАКАЕ ДАЛЁКАЯ ДАЛЬ

У НАС ЯШЧЭ няма сваёй біяграфіі. Дакладней, у атрада яна ёсць: шматгадовая, цікавая, з цеплынёй сяброўскіх усмешак і моцным поціскам рук, з нялёгкімі перамогамі ў спартыўных спаборніцтвах, гаркавата-прыемным пахам вогнішча і незабыўнымі радкамі лістоў. Для сённяшніх байцоў нашага атрада ўсё толькі пачынаецца. Мы яшчэ напішам свой летапіс. А пакуль будучае ўяўляецца не зусім выразным, бо месца дыслакацыі атрада «Мінск-85» — замежная краіна, і цэлы месяц мы будзем працаваць, падарожнічаць і адпачываць у Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы.

I ўсё ж сёння, на фінішы падрыхтоўчага перыяду, мы ўжо можам нешта сказаць пра сябе, сказаць ад імя універсітэцкага студэнцкага атрада «Мінск-85».

...Сакавік. Першы сход. Неяк нясмела там-сям завязваецца і адразу ж абрываецца гаворка. Цішыня, зразумелая цішыня ў асяроддзі амаль незнаёмых людзей: такія ўсе розныя.

У думках праводжу паралелі, хачу знайсці нешта агульнае. А яго пакуль мала: усіх кандыдатаў у байцы атрада прапанавалі камітэты камсамола факультэтаў, у кожнага з нас за плячыма не менш як 2—3 СБА.

Камандзір называе прозвішчы. Танклявая дзяўчына з заклапочаным тварам просіць дазволу пакінуць сход, спазняецца на пасяджэнне. Недзе бачыла яе. Здаецца, на канферэнцыі. Так, Таццяна Кругленя — сакратар камітэта камсамола геафака.

Ніну Хрыпач памятаю з мінулага лета. Тады яна была камісарам у сваім філфакаўскім атрадзе, з падшэфнымі старшакласнікамі часта наведвалася ў штаб працоўных спраў.

Прыглядаюся, пазнаю, прыпамінаю. З Ірынай Мядзведзевай побач сталі і чыталі ўголас рэзалюцыю студэнцкага інтэрнацыянальнага фестывалю, які прайшоў ва універсітэце і быў прысвечаны XII Сусветнаму фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве.

...Будзем працаваць каля Иены, наведаем Берлін, Лейпцыг... Хуценька запісваю, азіраюся. Амаль ва ўсіх аднолькавыя блакноты з памяткай: дэлегату XXXII справаздачна-выбарнай камсамольскай канферэнцыі БДУ. Вось яно, агульнае для нас — грамадская работа.

...Красавік. Ніхто не стане аспрэчваць, што ў атрадзе многае залежыць ад кіраўніцтва. Камандзір Пётр Лапцёнак першым паспрабаваў растапіць паміж намі крышталікі адчужанасці:

— Ірына, чаму ты гітару не прынесла?

Мы сядзім у вячэрнім паўзмроку студэнцкага клуба «Красавік» і сочым, як пальцы дзяўчыны дакранаюцца да струн. Задуменне парушае Тарэса Руткоўская. Яна зноў прапануе перагледзець сцэнарый агітбрыгады.

Вольга Марчанкова зараз прачытае праграму Дня рэспублікі, які мы будзем праводзіць на месцы дыслакацыі.

Шалясцяць аркушы паперы, з вуснаў зрываюцца абрыўкі верша.

На сённяшняй рэпетыцыі рэжысёрскія абавязкі выконвае Віктар Схаба. Здзіўляюся, як ён прыкмячае няўлоўныя тонкасці, раіць, прапаноўвае, уваходзіць у ролю і хутка пераключаецца на іншае. Лена Бабовіч не стрымалася:

— Ты цудоўна сыграў Васкова,— гэта яна пра апошнюю ролю Віктара ў студэнцкім народным тэатры БДУ.

— Апошні раз, і пойдзем,— Зоя Калтунчык дырыжорскім жэстам перапыняе смех і мітусню.

Дзіма Васілеўскі дае ўмоўны акорд. Гэту песню мы прыдумалі самі. Дакладней, склалі. Бо нічога прыдуманага ў ёй няма. Яна пра атрадныя сходы, сустрэчы ў спартыўнай зале, пра нашы агульныя справы і мары.

...Май. Ур-ра-а-а! Мы перамаглі! Наш «Мінск-85» — лепшы студэнцкі атрад па выніках злёту СБА універсітэта. Восем Ганаровых грамат, прызы, падарункі.

— Сябры, а памятаеце? — нехта зноў нагадвае, як дзяўчаты гулялі ў футбол. Вольга Марчанкова, сціплая, крыху нават баязлівая, абараняла вароты. Трэцяе месца каманды — гэта яе перамога над сабой.

Хлопцы — проста малайцы. Урэзаліся ў памяць грацыёзныя, па-майстэрску адшліфаваныя рухі Сашы Янава, Вані Галімскага. Нашы байцы былі першымі ў большасці відаў спаборніцтваў. Як мы за іх хваляваліся!

...Аўтобус павольна выпаўзае на гарадскую вуліцу. Заканчыўся злёт, вяртаемся. З рук у рукі перадаём радыёпрыёмнік — наш галоўны прыз. На тварах — усмешкі радасці і задавальнення.

Прыпамінаю, што было некалькі месяцаў назад. Як мы не падобны зараз на тых, якімі былі раней. І я, і Коля Рудэня, і Ірына Лук'яненка...

Камісар Мінскага абласнога штаба СБА І. М. Мішкарудны ў студэнцкія гады таксама ездзіў з атрадам у ГДР. Зараз у саставе журы праглядаў газеты СБА. Спыніўся каля нашай палаткі. Убачыў, што мы спяваем, цесным колам акружыўшы Ірыну Мядзведзеву:

— А вы, бачу, малайцы, ужо паспелі па-сапраўднаму пасябраваць.

...Нас чакае далёкая даль. Але як бы ні сустрэла невядомая дарога, побач будуць сябры, на якіх можна спадзявацца. У гэтым упэўнены мы ўжо сёння.

**А. ГРЫШКЕВІЧ,**
**баец СБА «Мінск-85».**



*АТРАД «СТЭЛУЦА» — адзін з лепшых на мехмаце. Магчыма таму, што падрыхтоўчы перыяд тут пачынаецца яшчэ задоўга да выезду на месца дыслакацыі. Магчыма таму, што тут своеасаблівыя адносіны да навічкоў, што ў атрада свае добрыя традыцыі.*

*Камандзір атрада — Ірына Шарашкіна. Ужо трэці год едзе Ірына з атрадам, другі — яго камандзірам. У гэтым годзе «Стэлуца» будзе працаваць у Стаўрапольскім краі. Другі год у ліку байцоў атрада і Людміла Назаранка.*

*Шмат спраў зараз і ў начальніка штаба працоўных спраў мехмата Алена Францкевіч.*

*НА ЗДЫМКУ: А. Францкевіч разам з І. Шарашкінай і Л. Назаранка абмяркоўваюць пытанні атраднага жыцця.*

***Фота А. ВАЛОШЫНА.***

**СУСТРЭЧЫ ДЛЯ ВАС**

# Ігар ДАБРАЛЮБАЎ:
# «у жыцці нельга без фізкультуры»

**Наш субяседнік — выпускнік універсітэта, кінарэжысёр Ігар Міхайлавіч Дабралюбаў, аўтар больш чым дзесяці кінафільмаў. Сярод іх такія вядомыя карціны, як «Іван Макаравіч», «Шчаслівы чалавек», «Расклад на паслязаўтра», «Трэцяга не дадзена», «Белыя Росы» і іншыя. Але Ігар Міхайлавіч мае яшчэ і цікавую спартыўную біяграфію. Ён — майстар спорту па спартыўнай хадзьбе, у мінулым — член зборнай рэспублікі па лёгкай атлетыцы, першы майстар спорту ва універсітэце.**

— Ігар Міхайлавіч, як, на Вашу думку, суадносяцца словы «спорт» і «асоба»?

— У жыцці амаль кожны чалавек імкнецца стаць асобай. У спорце гэта набывае асаблівы сэнс. Бо спорт патрабуе ад кожнага іменна тых якасцей, якія і робяць чалавека чалавекам, выяўляюць яго найбольш характэрныя, адметныя рысы. Я сябрую з многімі спартсменамі. Кожны з іх — яркая, непаўторная асоба. І чым больш у любой спартыўнай камандзе такіх яркіх індывідуальнасцей, тым лепшая каманда.

— А ўявіце сабе, Ігар Міхайлавіч, такую сітуацыю: спартсмен — студэнт. Вядома, і лекцыі яму нярэдка даводзіцца прапускаць, і семінары, і практычныя заняткі. Мімаволі ўзнікае пытанне: а які ж спецыяліст атрымаецца потым з такога студэнта?

— Гэта залежыць і ад студэнта, і ад выкладчыкаў. Мне няцяжка ўявіць сабе такую «фантастычную» сітуацыю. Я сам быў студэнтам аддзялення журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта і займаўся спортам. Займаўся сур'ёзна — уваходзіў у зборную каманду рэспублікі па лёгкай атлетыцы. І ніколі ніхто з выкладчыкаў не рабіў мне скідак і патуранняў. Экзамены і залікі я павінен быў здаваць калі і не разам з усімі, то здаваць абавязкова. Таму прыходзілася свой час размяркоўваць такім чынам, каб паспяваць і спортам займацца, і паспяхова вучыцца, ды яшчэ ўдзельнічаць у рабоце студэнцкага тэатра. Атмасфера ў нашым тэатры была абсалютна прафесійная па метадалогіі работы і патрабаваннях. Там не цярпелі прагульшчыкаў, а тым больш людзей, якія легкадумна адносіліся да працы. Іх адразу выключалі рашэннем савета тэатра. А варта адзначыць, што ў савет уваходзілі не кіраўнікі, а самі студэнты. На пятым курсе паехаў я на спартыўныя зборы на Каўказ. Рэгламент на зборах быў строгі, кожны дзень — па дзве, а то і па тры трэніроўкі. І ўсё ж я кожны дзень працаваў яшчэ і над дыпломнай работай на тэму «Пісараў — крытык Пушкіна». Аднак спорт мне не толькі не перашкаджаў, а, наадварот, арганізоўваў, прымушаў быць максімальна сабраным.

— Калі б у студэнцкія гады Вам прыйшлося ўсур'ёз выбіраць— спорт ці творчасць,— што б Вы выбралі?

— А я іх заўсёды сумяшчаў і не ставіў перад сабой дылему — тое або другое. І так яны цудоўна спалучаліся! Думаецца, наогул не варта надта строга размяжоўваць спорт і творчасць.

— А калі б у Вас наявілася магчымасць, скажам, усё пачаць спачатку, то цяпер якім відам Вы б заняліся?

— Ды ўсё тым жа! Хаця прыйшоў я ў лёгкую атлетыку не адразу. Спачатку, у пасляваенныя гады, усе хлопцы захапляліся футболам. Мы гулялі на любой, больш ці менш расчышчанай пляцоўцы. Ганялі бляшанкі з-пад кансерваў, пакрышкі, набітыя анучамі. Мяч быў тады неверагодная раскошай. Потым захапіўся я баскетболам. Але ў той час, калі паступіў ужо ва універсітэт, баскетбол прыкметна «вырас». Тады пачаў я займацца лёгкай атлетыкай. Спачатку спецыялізаваўся па бегу на сярэдніх дыстанцыях, а потым заняўся спартыўнай хадзьбой. Норму майстра спорту выканаў ужо ў гэтым відзе лёгкай атлетыкі.

— Які напрамак быў бы цяпер, на Ваш погляд, найбольш плённым для развіцця спорту?

— Напэўна, той, у якім цяпер ён і развіваецца. Гэта, з аднаго боку, стварэнне найбольш спрыяльных умоў для самага шырокага распаўсюджання ўсіх відаў спорту, для яго масавасці, а з другога боку — няспынны пошук талентаў, упартая, настойлівая праца з імі.

— Ці аказвае мастацтва ўплыў на спорт?

— Безумоўна. Мастацтва аказвае ўплыў на людзей, а спартсмены — гэта людзі, якія чытаюць, глядзяць фільмы, ходзяць у тэатры і на канцэрты. Наогул людзі мастацтва (нават тыя, хто ніколі не займаўся спортам) вельмі сябруюць са спартсменамі. Прырода гэтай сувязі невядомая, хаця, магчыма, пэўную ролю тут адыгрывае спаборніцкі момант.

— У чым прычына таго, што тэма спорту цудоўна адлюстравана ў пластычных мастацтвах і так слаба гучыць у кінамастацтве?

— Па-першае, спорт не ведаюць драматургі, па-другое, спорт не ведаюць рэжысёры. Але я б гэты папрок адрасаваў у першую чаргу драматургам. Мне траплялася шмат сцэнарыяў пра спорт, але ўсе яны закраналі спартыўную тэму ўвогуле, павярхоўна, абыходзячы вострыя вуглы. А праблемы ў спорце сур'ёзныя і глыбокія. Любяць паказваць маладога, поўнага сіл спартсмена, цэнтральнага нападаючага або цэнтральнага абаронцу зборнай каманды краіны, які і не думае, што калі-небудзь прыйдзецца развітацца з вялікім спортам. А развітанне з вялікім спортам — вельмі цяжкі працэс, нягледзячы на тое, што спартсмены знаходзяцца сярод асоб чулых і разумеючых — трэнераў, людзей, якія пасля адыходу ад вялікага спорту пачынаюць выхоўваць сабе падобных — спартсменаў і пераможцаў.

— А асабіста Вам хацелася б зняць фільм на спартыўную тэму?

— Я б з задавальненнем зняў карціну пра спорт, калі б мне трапіў)ся сцэнарый, які б паказваў спартыўнае жыццё ва ўсёй яго разнастайнасці, з усімі яго складанасцямі і праблемамі. У фільмах на спартыўную тэму прысутнічае якаясьці параднасць, калярова і яскрава апісваецца спаборніцкі момант, але ёсць яшчэ і другі бок спорту, амаль нікому не вядомы. Гэта — працэс штодзённай перамогі над сабой. Трэба перамагчы сябе велізарную колькасць разоў, каб чаго-небудзь дабіцца. Хацелася б зняць карціну па сцэнарыю, дзе выступалі б у адзінстве абодва бакі спорту. Надзей не страчваю!

Запісала
**І. ХАЛІП,**
студэнтка факультэта журналістыкі.


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.
6 чэрвеня 1985 г.
Зак. 2634. АТ 13388.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
З. А. АЛЯШКЕВІЧ.